МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# НАУКА. ОБРАЗОВАНИЕ. ТЕХНОЛОГИИ-2009

## МАТЕРИАЛЫ II МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

**10—11 сентября 2009 г.**
**г. Барановичи**
**Республика Беларусь**

**В 2 частях**
**Часть 2**

Барановичи
РИО БарГУ
2009

Репозиторий БарГУ

УДК 37(063)
ББК 74.58
Н34

Рекомендовано к печати научно-методическим советом учреждения образования
«Барановичский государственный университет»

Р е ц е н з е н т ы:

*Н. Я. Игнатенко,* доктор педагогических наук, профессор (Крымский гуманитарный университет, Украина);
*Л. Малиновская,* доктор педагогических наук, ассоциированный профессор
(Латвийский сельскохозяйственный университет, Латвия)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:

*В. И. Кочурко* (гл. ред.), *В. Н. Зуев* (отв. ред.), *И. В. Дубень, Г. Я. Житкевич, Н. В. Зайцева, Е. Г. Карапетова, З. Н. Козлова, С. А. Коршун, Ю. В. Маслов, О. И. Наранович, А. В. Никишова, Е. И. Пономарева, С. К. Рындевич, В. В. Хитрюк, Д. А. Ционенко, Т. Р. Якубович*

**Н34** **Наука. Образование. Технологии-2009** [Текст] : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., 10—11 сентября 2009 г., Барановичи, Респ. Беларусь : в 2 ч. / редкол. : В. И. Кочурко (гл. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2009. — Ч. 2. — 214 с. — 150 экз.
ISBN 978-985-498-226-7
ISBN 978-985-498-228-1 (Часть 2)

В сборнике приведены материалы, представленные на Международную конференцию «Наука. Образование. Технологии-2009», в которой отражены результаты научно-исследовательской работы Беларуси, России, Украины, Казахстана, Азербайджана, Ирландии, Польши, Латвии, Литвы, Словакии; освещены актуальные проблемы инженерной науки, экономики, права, педагогических и филологических наук, экологии.
Издание предназначено для широкого круга научных работников, преподавателей, аспирантов и студентов.

**УДК 37(063)**
**ББК 74.58**

**ISBN 978-985-498-226-7**
**ISBN 978-985-498-228-1 (Часть 2)**

© Коллектив авторов, 2009
© УО БарГУ, 2009

Репозиторий БарГУ

этим исследованиям должны коллективная выработка единого инструментария, разработка и утверждение единых критериев, целей, допущений, чтобы изучение шло по единой программе, с использованием единообразной методики по всероссийской выборке под заранее объявленные цели.

Выйдя за рамки узко понимаемого законодательства к широкому толкованию нормотворчества, можно, помимо социального аспекта, рассмотреть документационное обеспечение деятельности подразделений исполнительной власти, например содержание административных регламентов. Возможно, что в перспективе такое направление исследований может оформиться в виде нового научного направления и новой образовательной синтетической дисциплины.

**Резюме.** Организация научно обоснованного мониторинга права может уменьшить остроту существующей проблемы неудовлетворительного правового регулирования. Задачи организации такого мониторинга решается в основном как государственные. Отсутствует даже дефиниция правового мониторинга как общего феномена наблюдения, не решен вопрос о создании Свода законов Российской Федерации. В то же время есть научные центры - Институт законодательства и сравнительного правоведения при Правительстве Российской Федерации, РАГС при Президенте Российской Федерации и др., которые работают в данном направлении. Предлагается более широкий научный подход к подобному мониторингу с привлечением имеющегося научного потенциала.

**Resume.** The organisation of scientifically well-founded monitoring of the right can reduce a sharpness of an existing problem of unsatisfactory legal regulation. Problems of the organisation of such monitoring it is decided basically as state. There is no even a definition of legal monitoring as general phenomenon of supervision, the question on creation of the Code of laws of the Russian Federation is not dealt with. At the same time there are centres of science — legislation and comparative jurisprudence Institute at the Government of the Russian Federation, Academy at the President of the Russian Federation, etc. which work in the given direction. Wider scientific approach to similar monitoring with attraction of present scientific potential Is offered.

***А. У. Літвінскі***
Установа адукацыі
«Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ЗАХОДНЕРУСІСЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў САВЕЦКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУЦЫ

**Ключевые слова:** историография, западноруссизм, идеология, славянофильство, концепция.
**Key words:** historiography, zapadno-russism, ideology, Slavyanophilstvo, conception.

У наш час надзённай неабходнасцю з’яўляецца вывучэнне беларускай гістарычнай самасвядомасці як падмурка таго комплекса ідэй і пачуццяў, які мы называем патрыятызмам. Структура гістарычнай свядомасці сярэднестатыстычнага беларуса досыць складаная, і значнае месца ў ёй займаюць набытыя ў перыяд існавання СССР веды, уяўленні і стэрэатыпы.

Савецкая канцэпцыя гісторыі Беларусі, нягледзячы на як быццам відавочную ідэалагічную адназначнасць, у працэсе свайго развіцця адчувала ўплыў папярэдняй, дарэвалюцыйнай гістарыяграфічнай традыцыі. Зразумела, элементы дадзенай традыцыі, адпаведным чынам «адфільтраваныя» і інтэрпрэтаваныя савецкімі навукоўцамі, уносілі пэўны ўклад у фарміраванне гістарычнай памяці беларусаў. Вывучэнне ўкладу дарэвалюцыйнай гістарычнай навукі ў афіцыйную савецкую канцэпцыю гісторыі Беларусі вельмі актуальнае, паколькі дазваляе прааналізаваць структуру ўяўленняў беларусаў пра сваё мінулае. Між тым, праблема гэтага ўкладу амаль не распрацавана сучаснымі беларускімі навукоўцамі, таму яе даследаванне ўпіша новую старонку ў гісторыю айчыннай гістарычнай навукі.

Дадзены артыкул прысвечаны разгляду пытання аб уплыве ідэй славянафільскай гістарыяграфіі (і заходнерусізму як яе канкрэтна-гістарычнай формы) на асобныя бакі савецкай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Мэтай даследавання з’яўляецца вывучэнне ступені, формаў і характару гэтага ўплыву. Задачы даследавання вызначаюцца яго мэтай і ўключаюць у сябе аналіз поглядаў гісторыкаў-заходнерусістаў на падзеі і з’явы гісторыі Беларусі, а таксама тых заходнерусісцкіх ідэй, якія ў інтэрпрэтаваным выглядзе выкарыстоўвала савецкая гістарычная навука. У працэсе яго падрыхтоўкі аўтар кіраваўся метадалагічнымі прынцыпамі аб’ектыўнасці і гістарызму, выкарыстоўваў метады параўнальна-гістарычнага і структурна-функцыянальнага аналізу. Зразумела, фармат артыкула дазваляе акрэсліць толькі асноўныя тэндэнцыі ў разглядзе дадзенай навуковай праблемы і вымушае пакінуць па-за ўвагай гістарыяграфічныя факты, якія ў пэўным сэнсе супярэчаць гэтым тэндэнцыям.

Славянафільская традыцыя вывучэння гісторыі Беларусі існавала ў форме заходнерусісцкай гістарыяграфіі (час існавання — другая паловаXIX—пачатак XX ст.), якой, пры пэўных ваганнях, былі ўласцівыя непрызнанне права на існаванне беларусаў у якасці самастойнага этнасу, манархізм і адданасць праваслаўю. Узнікае заканамернае пытанне: ці варта ўвогуле казаць пра нейкі ўплыў славянафільства на савецкую гістарычную навуку, якая прытрымлівалася зусім іншых прынцыпаў? Аднак не будзем адразу даваць адмоўны адказ. Справа ў тым, што ў 30-я гг. XX ст. палітычнае кіраўніцтва СССР паступова прыйшло да высновы аб мэтазгоднасці дапаўнення марксізму як пануючага светапогляду ідэяй расійскай вялікадзяржаўнасці, паколькі гэтае дапаўненне павінна было забяспечыць кансалідацыю савецкага грамадства.

Репозиторий БарГУ

Вось тут і спатрэбіліся напрацоўкі гістарыяграфічнай школы, прадстаўнікі якой у свой час засведчылі вернасць заходнерусізму. Безумоўна, гэтыя напрацоўкі не маглі быць прынятыя ў "класічным" выглядзе савецкай гістарычнай навукай, і таму адбылася іх пэўная мадэрнізацыя. Ды і пераемнасць гістарычных поглядаў не была непасрэднай, аднак іх падабенства даволі значнае.

Якія ж ідэі фактычна афіцыйнай сістэмы поглядаў, што існавала ў савецкай гістарычнай навуцы, пераклікаюцца са славянафільскай гістарыяграфіяй? Перш за ўсё, гэта тэзіс аб адзінай старажытнарускай народнасці. Для заходнерусістаў дадзены тэзіс быў настолькі відавочным, што яны не абцяжарвалі сябе сур'ёзнымі доказамі. Савецкая ідэалогія выкарыстоўвала дадзены тэзіс для барацьбы з беларускім (як, дарэчы, і ўкраінскім) нацыяналізмам.

У найбольшай ступені савецкая гістарыяграфія выкарыстоўвала пастулат заходнерусістаў аб перыядзе існавання Рэчы Паспалітай як часе заняпаду Беларусі [1, с. 376]. Яна амаль цалкам падзяляла погляд лідэра заходнерусісцкага накірунку ў гістарычнай навуцы М.В. Каяловіча аб заганным уплыве Польшчы на «заходнерускія» землі — уплыве, які нарастаў з часоў Крэўскай уніі [5, с. 141—147].

Як і заходнерусісты, савецкія гісторыкі вельмі адмоўна ставіліся да каталіцызму. Гэтая рэлігія заўжды лічылася ў Савецкім Саюзе чужой і небяспечнай. У шмат чым палітычная кан'юнктура заахвочвала навукоўцаў да стварэння надта ўжо негатыўнага вобразу каталіцызму. Пры гэтым яны, ацэньваючы мінулае беларускага народа, асцярожна, паколькі дзяржава была атэістычнай, але ўсё ж аддавалі перавагу праваслаўю.

У адстойванні тэзісу аб польска-каталіцкай экспансіі на землі ВКЛ савецкія гісторыкі фактычна паўтаралі аргументы М. В. Каяловіча і яго аднадумцаў [3, с. 117—141; 5, с. 111—120]. Напрыклад, і тыя, і другія, адмаўляліся бачыць штосьці станоўчае ў дзейнасці Ордэна езуітаў — «сусветных рэакцыянераў», па выразе П. М. Жуковіча — найбольш здольнага вучня М. В. Каяловіча [2, с. 385].

Няма істотных адрозненняў у пазіцыі прадстаўнікоў славянафільства і савецкіх навукоўцаў адносна канцэптуальнай ацэнкі ўніяцтва і ўніяцкай царквы. «Унія засноўвалася на падступнасці і ашуканстве», — гэтую выснову М. В. Каяловіча ў прынцыпе падзялялі многія савецкія гісторыкі [4, I, с. 128]. Дарэчы, і тут гісторыкі абодвух пакаленняў і розных ідэалагічных аргументацый з негатыўных пазіцый ставіліся да езуітаў, якія, на іх думку, былі арганізатарамі аб'яднання цэркваў [5, с. 194, 195] Таксама, як і заходнерусісты, яны разглядалі ўніяцкую царкву ў якасці інструмента для акаталічвання беларускага народа [1, с. 397]. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што прыхільнікаў уніяцтва, напрыклад, І. Кунцэвіча, прадстаўнікі славянафільскай гістарыяграфіі малявалі чорнымі фарбамі [1, с. 442; 4, II, с. 128—138]. Не святлейшымі былі і фарбы, якімі карысталіся савецкія гісторыкі.

Цалкам лагічна, што гісторыкі-заходнерусісты, у адпаведнасці са сваёй канцэпцыяй, горача віталі далучэнне зямель Беларусі і Украіны («Заходняй Расіі», па іх тэрміналогіі) да Расійскай імперыі і лічылі гэтую падзею паваротнай у гісторыі рэгіёна. Жыхары Беларусі сярэдняга і сталага ўзросту, якія калісьці вучыліся ў савецкіх школах і цікавіліся навукай аб мінулым, павінны выдатна памятаць, што ў школьных падручніках падзелы Рэчы Паспалітай ацэньваліся са станоўчага пункту гледжання, паколькі забяспечвалі ўз'яднанне Беларусі з Расіяй. Падабенства канцэптуальных пазіцый славянафільскай гістарыіграфіі з панаваўшай у савецкай гістарычнай навуцы сістэмай поглядаў па дадзеным пытанні не выклікае сумнення, хаця аргументацыя была рознай (не маглі ж навукоўцы-марксісты бачыць станоўчы сэнс у вяртанні дамінавання праваслаўя, як тое рабілі славянафілы).

Такім чынам, савецкая гістарычная навука, дэкларуючы адмоўныя адносіны да славянафільскай па ідэалагічным паходжанні гістрарыяграфіі, у пэўнай ступені, спакваля выкарыстоўвала яе навуковыя напрацоўкі. Прынамсі, назіраецца пераемнасць паміж заходнерусісцкай і афіцыйнай савецкай гістарыяграфіяй у адносінах да важнейшых аспектаў навукова-гістарычных канцэпцый, якія асвятляюць мінулае Беларусі. У прыватнасці, можна сцвярджаць аб супадзенні пазіцый альбо аб іх падабенстве па такіх пытаннях, як паходжанне рускіх, украінцаў і беларусаў, гістарычны лёс усходнеславянскіх народаў у складзе Рэчы Паспалітай, характар уплыву Польшчы на гэтыя народы, месца і роля каталіцызму, а таксама ўніяцтва ў гісторыі рэгіёна, значэнне далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.

**Спіс крыніц**

1. *Брянцев, П. Д.* История Литовского государства с древнейших времён / П. Д. Брянцев. – Вильна, 1889. – 659 с.
2. *Жукович, П. Н.* Кардинал Гозий и польская церковь его времени / П. Н. Жукович. – СПб., 1892. – 542 с.
3. *Коялович, М. О.* Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. – М., 1864. – 348 с.
4. *Коялович, М. О.* Литовская церковная уния. Исследования / М. О. Коялович. – Т. 1 – 2, СПб., 1859 – 1861. – 316 с. + 443 с.
5. *Коялович, М. О.* Чтения по истории Западной России профессора М. Кояловича. Новое изд., переработанное и дополненное с 1-го изд. 1864 г. / М. О. Коялович. – СПб., 1884. – 349 с.

**Резюме.** В статье рассматривается проблема западноруссистских традиций в советской историографии. Достигнутые результаты позволяют оценить идейный вклад западноруссистской историографии в официальную советскую концепцию истории Беларуси.

**Resume.** This article is about problem of the zapadno-russism traditions in the Soviet historiography. The achieved results make it possible to assess the zapadno-russism historiography ideas contribution to the official Soviet conception of the history of Belarus.

Репозиторий БарГУ